Пра візіт Міністра сувязі і інфарматызацыі Беларусі ў Егіпет

З 2 па 4 красавіка 2018 года пры садзейнічанні Пасольства Беларусі ў Егіпце адбыўся візіт у Егіпет Міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Сяргея Папкова. У візіце прыняў удзел рэктар УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі» Андрэй Зяневіч.

У ходзе візіту Сяргей Папкоў правёў перамовы з Міністрам сувязі і інфармацыйных тэхналогій Егіпта Я.аль-Кадзі пры ўдзеле прадстаўнікоў Нацыянальнага рэгулюючага агенцтва па тэлекамунікацыях, Агенцтва па развіццю індустрыі інфармацыйных тэхналогій, Групы экстранага камп'ютэрнага рэагавання, Нацыянальнага тэлекамунікацыйнага інстытута і Адміністрацыі інтэлектуальнай вёскі Егіпта.

Бакі абмеркавалі пытанні пабудовы сучаснай лічбавай эканомікі на прыкладзе дасягненняў Рэспублікі Беларусь, спосабы пашырэння супрацоўніцтва ў галіне кібербяспекі, інавацый і прадпрымальніцтва, абмену вопытам у сферы стварэння тэхнапаркаў, даследаванняў і распрацовак у галіне інфармацыйных тэхналогій, а таксама падрыхтоўкі кадраў у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) у рамках магістарскіх праграм і кароткатэрміновых курсаў на базе Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі.

Дэлегацыя азнаёмілася з магчымасцямі інтэлектуальнай вёскі Егіпта, а таксама наведала Цэнтр дакументацыі культурнай і прыроднай спадчыны Егіпта.

Кіраўнік ведамства сустрэўся з Прэм'ер-міністрам Егіпта Шэрыфам Ісмаілам. Былі абмеркаваны перспектыўныя напрамкі беларуска-егіпецкага супрацоўніцтва ў галіне сувязі і інфармацыйных тэхналогій. Дасягнута дамоўленасць аб накіраванні дэлегацыі егіпецкіх спецыялістаў у галіне ІКТ для ўдзелу ў Міжнародным форуме па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях "ТІБО 2018.» у г.Мінску.

У прысутнасці Прэм'ер-міністра Егіпта бакі падпісалі Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам сувязі і інфармацыйных тэхналогій Арабскай Рэспублікі Егіпет па пытаннях супрацоўніцтва ў галіне сувязі і інфармацыйных тэхналогій.

Беларуская дэлегацыя прыняла ўдзел у «круглым стале» «Беларусь-Егіпет: перспектывы і магчымасці для супрацоўніцтва ў ІТ-сферы», арганізаваным Егіпецкім саветам міжнароднага супрацоўніцтва, у якім удзельнічалі прадстаўнікі больш за 40 буйных кампаній і арганізацый Егіпта, зацікаўленыя ў супрацоўніцтве з Рэспублікай Беларусь у сферы ІКТ.

У рамках «круглага стала» Міністр асвятліў асноўныя напрамкі развіцця сферы ІКТ у Рэспубліцы Беларусь. Абмеркаваны пытанні сумеснай распрацоўкі і вытворчасці абсталявання ў галіне ІКТ, аўтсорсінгу камп'ютарных паслуг, супрацоўніцтва ў галіне будаўніцтва тэлекамунікацыйных сетак, кантрактнай трансферу тэхналогій, абмену вопытам у сферы пераўтварэння інфармацыі ў лічбавую форму.

Праведзена прэзентацыя магчымасцяў беларускай акадэміі сувязі, у тым ліку прадстаўлена

тэхналогія «разумны дом» і магчымасці ажыццяўлення навуковых даследаванняў у галіне сувязі.

Таксама падпісана Пагадненне паміж Беларускай дзяржаўнай акадэміяй сувязі і Нацыянальным тэлекамунікацыйным інстытутам Егіпта аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі і навукі.

Па завяршэнні візіту Міністр С.Папкоў даў інтэрв'ю егіпецкаму тэлебачанню і прадстаўнікам іншых сродкаў масай інфармацыі Егіпта.

Крыніца: http://egypt.mfa.gov.by

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/05-04-2018-2918*